УДК 069:908 (476):[069.12+351.852]

# ЭКСКУРСІЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ

***І. І. Бамбешка,*** *старшы выкладчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле прыведзены рэтраспектыўны аналіз такой базавай формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, як экскурсія. У якасці аб'екта даследавання абраны краязнаўчыя музеі сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Асноўнымі крыніцамі паслужылі справаздачы музеяў, іх сайты, інтэрв'юіраванне супрацоўнікаў музеяў і інш. Адзначаецца, што экскурсія ўзнікла адначасова з самімі краязнаўчымі музеямі ў сярэдзіне 1850-х гг. і эвалюцыяніравала пад уплывам разнастайных сацыякультурных абставін за кошт пашырэння яе варыятыўнасці, з'яўлення дыялогавых форм зносін музейнага супрацоўніка і музейнага наведвальніка і інш. На падставе традыцыйных параметраў (змест ці характар тэматыкі, месца правядзення і аб'екты паказу, мэтавая скіраванасць, склад экскурсантаў) праведзены аналіз разнастайнасці экскурсійных практык, якія прапануюцца сучаснымі краязнаўчымі музеямі. Асаблівая ўвага надаецца ўкараненню новых методык у экскурсійную дзейнасць.

**Ключавыя словы:** культурна-адукацыйная дзейнасць, экскурсійная дзейнасць, краязнаўчы музей, гісторыка-культурная спадчына, актуалізацыя спадчыны.

# EXCURSION ACTIVITY OF LOCAL LORE MUSEUMS OF BELARUS: TRADITIONS AND INNOVATIONS

***I. Bambeshka,*** *Senior Lecturer of Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Establishment «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article provides a retrospective analysis of such a basic form of cultural and educational activities of the museum as an excursion. Local history museums of the system of the Ministry of Culture of the Republic of Belarus were selected as the object of research. The main sources were reports of museums, their websites, interviews with museum staff, etc. The author notes that the excursion arose simultaneously with the local history museums themselves in the mid-1850s. and evolved under the influence of various sociocultural circumstances due to the expansion of its variability, the emergence of dialogical forms of communication between a museum employee and a museum visitor, etc. Based on traditional parameters (content or nature of the topic, place and objects of display, target orientation, composition of visitors, etc.), the author analyzed the variety of excursion practices offered by contemporary local history museums. Particular attention is paid to the introduction of new techniques in the excursion activities of local history museums.

**Keywords:** cultural and educational activities, excursion, local history museum, historical and cultural heritage, actualization of heritage.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гісторыка-культурная спадчына ўяўляе сабой складаную сацыякультурную сістэму, з'яўляецца неад'емнай часткай сучаснага свету і актыўна ўзаемадзейнічае з асяроддзем і часам. Яна служыць дзейсным рэсурсам фарміравання і развіцця асобы, этнасу і грамадства. Выключная роля ў працэсе захавання і засваення мясцовай гісторыка-культурнай спадчыны належыць краязнаўчым музеям, якія складаюць самы значны сегмент у структуры айчыннай музейнай сеткі (53,4 % ад агульнай колькасці). Краязнаўчыя музеі выконваюць місію захавання гісторыка-культурнай спадчыны канкрэтнага, тэрытарыяльна абмежаванага, сацыякультурнага асяроддзя, з'яўляючыся яго актыўным кампанентам. Сучасны сацыякультурны кантэкст выводзіць на першы план здольнасць краязнаўчага музея не толькі захоўваць, але актуалізаваць гісторыка-культурную спадчыну – уключаць у сучасную культуру шляхам актывізацыі сацыякультурнай ролі яе аб'ектаў і іх інтэрпрэтацыі. Падобная практыка знаходзіць увасабленне ў разнастайнай культурна-адукацыйнай дзейнасці, найбольш распаўсюджанай формай якой з'яўляецца экскурсія.

Першым вопытам наладжвання экскурсій у краязнаўчых музеях Беларусі можна лічыць дзейнасць Віленскага музея старажытнасцей, дзе спецыяльна прызначаны супрацоўнік даваў тлумачэнні наведвальнікам [3, с. 35]. Падобная практыка існавала і ў некаторых іншых мясцовых музеях (напрыклад, музеях Віцебскага і Магілёўскага статыстычных камітэтаў). Больш шырока экскурсійная дзейнасць краязнаўчых музеяў разгарнулася ў міжваенны перыяд. Крыніцы сведчаць аб добра пастаўленай экскурсійнай справе ў Слуцкім і Бабруйскім акруговых краязнаўчых музеях і іншых музеях рэспублікі [7, с. 74; 8, с. 58]. Менавіта ў 1920–30-я гг., дзякуючы намаганням расійскіх і савецкіх тэарэтыкаў і практыкаў экскурсійнай справы (М. П. Анцыферава, А. В. Бакушынскага, І. М. Грэўса і інш.), быў распрацаваны экскурсійны метад, заснаваны на сукупнасці наступных прымет: першаснасці зрокавых уражанняў, перавазе паказу над расказваннем, маторнасці, тэматычнасці, актывізацыі аўдыторыі.

Музейныя экскурсіі ў сваім развіцці прайшлі шлях ад асветніцкіх, характэрных для другой паловы XIX – пачатку 1920-х гг., да агітацыйна-ідэалагічных у 1930–80-х гг. У канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. на моцнай хвалі дэмакратызацыі ідэалагізаваны змест экскурсій перастаў адпавядаць сацыякультурнай сітуацыі. У цяжкі перыяд палітычнага і эканамічнага крызісу колькасць наведавальнікаў скарачалася, і экскурсійная форма аказалася на пэўны час незапатрабаванай, што дазволіла асобным даследчыкам меркаваць аб тым, што яна паступова апынулася на перыферыі музейнай камунікацыі. Аднак у канцы 1990-х – пачатку 2000-х гг. увага да экскурсіі як формы культурна-адукацыйнай дзейнасці павялічылася. Так, калі ў 2000 г. сэрэдняя колькасць наведвальнікаў музеяў сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (134 музеі) складала 3804,1 чал., то ў 2010 г. 158 музеяў за год наведала ў сярэднім 4 989,7 чал., а ў канцы 2018 г. колькасць музеяў істотна не змянілася (159), у той час як сярэдняя колькасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наведвальнікаў павялічылася амаль у паўтары разы і склала 6 958,4 [1]. Пацвярджае гэта і аналіз інтэрнэт-рэсурсаў краязнаўчых музеяў: усе музеі заяўляюць аб наяўнасці экскурсіі як асноўнай формы іх работы з наведвальнікамі. Пры гэтым колькасць прапанаваных наведвальнікам экскурсій вагаецца ад 4-5 (Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей) да 45 (Рэчыцкі краязнаўчы музей разам з філіяламі) [9; 10]. Гэта дазваляе сцвярджаць, што сёння экскурсія з'яўляецца абавязковай і адной з самых распаўсюджаных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці.

Стабільнасць і запатрабаванасць экскурсіі можна растлумачыць тым, што кожная музейная экскурсія заснавана на аўтэнтычных музейных прадметах, дыяпазон якіх у краязнаўчых музеях вельмі шырокі – ад помніка прыроды да твора мастацтва. Яны валодаюць вялікім пазнавальным патэнцыялам, з'яўляюцца адлюстраваннем працэсаў развіцця прыроды і грамадства, канкрэтнай эпохі, лёсу асобы ці цэлага народа. Экскурсія спалучае прадметы і прастору ў адзіны камунікацыйны музейны рытуал – цікавае музейнае падарожжа ў пошуках новых ведаў, адкрыццяў і ўражанняў.

Музейныя экскурсіі дастаткова разнастайныя. Паводле *зместу ці характару тэматыкі вылучаюць аглядныя экскурсіі, экскурсіі на тэмы профільнай дысцыпліны (тэматычныя) і цыклы экскурсій.* Аглядныя экскурсіі – найбольш масавыя з усіх відаў экскурсій. Яны прадугледжаны для наведвальнікаў (у прыватнасці, турыстаў), якія ўпершыню прыйшлі ў музей і жадаюць атрымаць агульнае ўяўленне пра яго гісторыю і калекцыі. Звесткі, якія падаюцца ім падчас агляднай экскурсіі, носяць інфарматыўны характар і знаёмяць з гісторыяй і зместам музейнага збору, музейнай экспазіцыяй і найбольш значнымі экспанатамі. Бываюць выпадкі, калі аглядныя экскурсіі папярэднічаюць цыклу тэматычных. Аднак трэба падкрэсліць, што менавіта ў аглядных экскурсіях, паколькі яны адразу ахопліваюць значныя гістарычныя перыяды і паслядоўна знаёмяць з помнікамі розных гістарычных перыядаў, можна выразна прасачыць заканамернасці сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця пэўнай тэрыторыі. У такіх экскурсіях перад наведвальнікам краязнаўчага музея разгортваецца шырокая панарама гісторыі і творчасці многіх пакаленняў.

Экскурсіі на тэмы профільнай дысцыпліны ў музейнай практыцы часцей называюць тэматычнымі, што не зусім карэктна, паколькі любая экскурсія мае тэму. У той жа час менавіта тэматычныя экскурсіі дазваляюць падрабязна раскрыць спецыфіку пэўнай мясцовасці, канкрэтызаваць асобныя моманты яе гісторыі, культуры і прыроды. Падобныя экскурсіі арыентаваны на тую частку музейнай аўдыторыі, якая прыходзіць у музей рэгулярна. Яны вельмі запатрабаваны ў арганізаваных груп школьнікаў, навучэнцаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, студэнтаў і займаюць важнае месца ва ўзаемадзеянні музея з гэтымі інстытутамі. Аналіз дзейнасці краязнаўчых музеяў Беларусі паказаў: кожны такі музей прапануе ў сярэднім 5-6 тэматычных экскурсій, якія актуалізуюць пераважна этнаграфічныя рысы пэўнай мясцовасці, падзеі Другой сусветнай вайны, пас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ляваеннае і сучаснае развіццё і г. д. Асаблівасці гістарычнага і культурнага развіцця рэгіёна, актыўнасць навукова-даследчай дзейнасці супрацоўнікаў абумоўліваюць распрацоўку экскурсій, уласцівых канкрэтнаму музею, якія немагчыма пачуць у іншых. Так, напрыклад, гісторыя Слуцкай гімназіі, што дзейнічала ў 1617–1918 гг., стала тэмай экскурсіі Слуцкага краязнаўчага музея; адна з тэматычных экскурсій Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея «Рэвалюцыянеры-народнікі Бонч-Асмалоўскія» распавядае пра гісторыю сям'і рэвалюцыянераў-памешчыкаў, іх сяброў і паплечнікаў па рэвалюцыйнай дзейнасці.

*Па месцы правядзення і аб'ектах паказу* экскурсіі падзяляюцца на экскурсіі па музейных экспазіцыях, па адкрытым захаванні фондаў і фондасховішчах і комплексныя экскурсіі. Экскурсіі ў сучасных краязнаўчых музеях праводзяцца пераважна па музейных экспазіцыях і выстаўках. Экскурсіі па адкрытым захаванні фондаў у практыцы краязнаўчых музеяў сустракаюцца толькі ў асобных выпадках. У Беларусі выяўлены толькі адзін прыклад такой экскурсіі: у Гомельскім палацава-паркавым ансамблі наведвальнікам прапануюць пазнаёміцца з адкрытым захаваннем археалагічных калекцый музея, якое функцыянуе з 2010 г. [6, с. 168]. Амаль поўная адсутнасць такога тыпу экскурсій тлумачыцца тым, што падобнай формы захавання музейных прадметаў практычна няма ў краязнаўчых музеях Беларусі.

У апошнія гады краязнаўчыя музеі актыўна асвойваюць не толькі музейную, але і гарадскую прастору. Наведвальнікам прапануюцца комплексныя пешаходныя і аўтобусныя аглядныя экскурсіі, якія ўключаюць знаёмства з пастаяннай экспазіцыяй музея і мясцовай гісторыка-культурнай спадчынай. Падобныя экскурсіі з уключэннем адметных помнікаў рэгіёна тэматычна можна падзяліць на некалькі груп: *аглядныя гарадскія экскурсіі*; *маршруты па помніках гісторыка-культурнай спадчыны (архітэктурных, археалагічных, фартыфікацыйных, ваенных), размешчаных на тэрыторыі раёна параўнальна блізка ад музеяў*; *этнаграфічныя маршруты з наведваннем месцаў, дзе захаваліся ці адноўлены помнікі нематэрыяльнай культурнай спадчыны*; *комплексныя маршруты па горадзе і раёне, якія ўключаюць разнастайныя аб'екты экскурсійнага паказу*.

Экскурсіі з уключэннем пазамузейных аб'ектаў патрабуюць ад музеяў значных транспартных і матэрыяльных выдаткаў, выклікаюць арганізацыйныя складанасці, залежаць ад умоў надвор'я. Вопыт Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, які не абмежаваўся традыцыйнымі пешаходнымі і аўтобуснымі экскурсіямі, а ў 2008 г. сумесна з мясцовым трамвайна-тралейбусным дэпо прапанаваў жыхарам і гасцям горада новы экскурсійны маршрут «Трамвай і тралейбус выхаднога дня», з'яўляецца выключэннем, але вартым пераймання [4, с. 59].

*Па мэтавай скіраванасці* вылучаюць культурна-адукацыйныя і вучэбныя экскурсіі, непасрэдна звязаныя з праграмамі розных навучальных устаноў. Трэба адзначыць, што краязнаўчыя музеі прапануюць шырокі спектр вучэбных экскурсій для розных навучальных устаноў, у асноўным,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

безумоўна, для сярэдніх школ. Бываюць выпадкі, калі залы музея прадстаўляюцца настаўнікам школ і заняткі праводзяцца непасрэдна ў музеі (напрыклад, у Мінскім абласным краязнаўчым музеі).

*Па складзе экскурсантаў* вылучаюць экскурсіі для дзіцячай ці дарослай аўдыторыі, для турыстаў ці для мясцовых жыхароў, для груп аднародных ці разнародных (напрыклад, для бацькоў з дзецьмі). У краязнаўчых музеях асноўнымі спажыўцамі экскурсій з'яўляюцца мясцовыя жыхары, сярод якіх пераважаюць школьнікі. Практычна ва ўсіх краязнаўчых музеях экскурсіі праводзяцца і для адзінкавых, і для сямейных наведвальнікаў.

Сучасны краязнаўчы музей вучыцца рэагаваць на змены патрабаванняў наведвальнікаў. Адбываецца мадэрнізацыя экскурсіі за кошт пашырэння яе варыятыўнасці, з'яўлення дыялогавых форм зносін музейнага супрацоўніка і музейнага наведвальніка. «Экскурсавод-лектар» саступае месца «экскурсаводу-праваднiку», паколькі задача перадачы культурнага вопыту робіцца больш важнай, чым простая трансляцыя ведаў. З'яўляюцца інтэрактыўныя, тэатралізаваныя экскурсіі, экскурсіі-квэсты, экскурсіі-вандроўкі, экскурсіі-анімацыі, распрацаваныя многімі краязнаўчымі музеямі рэспублікі (Брэсцкім, Івацэвіцкім, Мазырскім і інш.). У якасці прыкладу можна прывесці Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей, у якім у 2013 г. адкрылася новая экспазіцыя «Дарогамі сустрэч». Яе другая зала прысвечана гісторыі горада і яго адметнасцям: кірмашу, вырабу абаранак і т. зв. «Смаргонскай акадэміі». Яшчэ праз некаторы час супрацоўнікі музея ў межах Праграмы развіцця ААН пачалі рэалізоўваць праект «Захаваем культуру разам: Смаргонь кірмашовая», якая фінансавалася Еўрасаюзам [5]. У межах праекта была падрыхтавана карта славутасцей Смаргонскага раёна, буклет пра гісторыю смаргонскіх абаранкаў і перасоўная выстаўка «Смаргонь кірмашовая», якую ўпершыню прадставілі ў кастрычніку 2017 г. Галоўным вынікам праекта стала тэатралізаваная экскурсія з дэгустацыяй «Шляхамі кірмашовымі». Падчас экскурсіі наведвальнікі адпраўляліся на Смаргонскі кірмаш, дзе знаёміліся з яго традыцыямі, таварамі, лялечным тэатрам «Батлейка» і гісторыяй «Смаргонскай акадэміі». У якасці экскурсавода выступала гаспадыня-абаранкачніца, якая распавядала, паказвала, як у мястэчку традыцыйна выпякалі абаранкі, і частавала імі гасцей. Кульмінацыяй з'яўлялася сустрэча са своеасаблівым выхаванцам «Смаргонскай акадэміі» – мядзведзем, які праводзіў з наведвальнікамі розныя гульні.

У сувязі з неспрыяльнай эпідэміялагічнай абстаноўкай у 2020–2021 гг., абумоўленай распаўсюджаннем пандэміі COVID-19, адбылося рэзкае зніжэнне колькасці наведвальнікаў музеяў. У гэтай сітуацыі музеі былі вымушаны пашыраць свае камунікацыйныя тэхналогіі, у т. л. прэзентацыю дзейнасці музея ў медыяпрасторы, мультымедыйнае суправаджэнне экспазіцыйных і выставачных праектаў, якія дапамагаюць папулярызаваць і актуалізаваць аб'екты спадчыны і актывізаваць віртуальных гледачоў. Класічная экскурсія ў падобных умовах трансфармавалася ў *анлайн-экскурсію*, якая праходзіць у прамой трансляцыі ці ў відэазапісе. Вясной 2020 г. такую форму правядзення



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экскурсій пачалі выкарыстоўваць многія краязнаўчыя музеі, прадстаўляючы іх на ўласных YouTube-каналах (напрыклад, ВАКМ), інтэрнэт-сайтах ці старонках сваіх афіцыйных суполак у сацыяльных сетках. Напрыклад, ВАКМ прадставіў 10 анлайн-экскурсій пад агульнай назвай «Шэдэўры Мастацкага музея», якія распавядалі аб некаторых яго прадметах. Першая падобная экскурсія адбылася 4 красавіка 2020 г. і змяшчала агульную інфармацыю пра музей і яго гісторыю. Потым гледачам прадставілі экскурсію, якая распавядала пра твор невядомага майстра XVIII ст. «Хронас адкрывае ісціну». Наступныя анлайн-экскурсіі ў межах згаданага праекта прадстаўлялі работы К. А. Каровіна, У. Я. Макоўскага, Ю. М. Пэна і інш. Па меркаванні спецыялістаў, падобныя праекты дазваляюць з дапамогай сучасных тэхнічных магчымасцей больш глыбока і падрабязна распавесці пра твор мастацтва.

Такім чынам, экскурсія прайшла доўгі шлях развіцця, у час якога яна пэўным чынам трансфармавалася пад уплывам разнастайных сацыякультурных абставін.

*1.* Аб выніках дзейнасці арганізацый культуры ў 2017 г. і задачах на 2018 г. [Электронны рэсурс] // Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: http://kultura.by/by/arhiu/. – Дата доступу: 09.12.2020.

*2. Галкина, Т. В.* Музейная педагогика: коммуникативный феномен экскурсии как базовой музейно-педагогической формы / Т. В. Галкина // Вестн. Томск. гос. пед. ун-та. – 2010. – № 4. – С. 63–67.

*3. Грабянчук, І.* Віленскі музей старажытнасцей: заснавальнікі і наступнікі / І. Грабянчук // Музейны веснік / Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2006. – Вып. 3. – С. 33–41.

*4. Ісачанка, А. Л.* Абагульненне вопыту работы з наведвальнікамі ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі / А. Л. Ісачанка // Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь: стан, тэндэнцыі, перспектывы : мат. рэсп. навук.-практ. канф., 24 лістап. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (старш.), С. М. Гаўрылава, А. А. Гужалоўскі. – Мінск, 2012. – С. 55–60.

*5. Кавальчук, А.* Сталіца «абваранкаў» і мядзведжая акадэмія. Як у Смаргоні фармуюць брэнд рэгіёну [Электронны рэсурс] / А. Кавальчук // Hrodna.life. – Рэжым доступу: https://hrodna.life/articles/u-smargoni-farmuyuc-brend-regiyonu. – Дата доступу: 09.12.2020.

*6.* Культура Беларусі: 20 год развіцця, 1991–2011 / С. П. Вінакурава [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. А. А. Галкіна, І. Р. Голубевай ; навук. рэд.: І. І. Крук, А. А. Галкін. – Мінск : Ін-т культуры Беларусі, 2012. – 326 с.

*7. Пяцэвіч, Р.* Краязнаўчы рух на Случчыне. (Да пяцігодзьдзя Слуцкага Краязнаўчага Таварыства) / Р. Пяцэвіч, У. Мікіцінскі, П. Ажэўскі // Наш край. – 1928. – № 12. – С. 62–78.

*8. Уладзіміраў, У.* Бабруйская акруга / У. Уладзіміраў // Наш край. – 1928. – № 2. – С. 57–59.

*9.* Экскурсии [Электронный ресурс] // Толочинский историко-краеведческий музей. – Режим доступа: http://tolochin.museum.by/node/29145. – Дата доступа: 21.12.2020.

*10.* Экскурсіі [Электронны рэсурс] // Рэчыцкі краязнаўчы музей. – Рэжым доступу: http://rechitsa.museum.by/be/node/51958. – Дата доступу: 12.05.2019.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ